

*Арнат. 3-я чвэрць 18 ст. Касцёл Яна Хрысціцеля. Вёска Воўпа Ваўкавыскага р-на.*

творамі дэкар.-прыкладнога мастацтва. Сустракаліся і А., выраблены са слуцкіх паясоў.

**АРО́Л М.** [сапр. Пяцельскі (Пятэльскі) Сцяпан Язэпавіч; каля 1890, нас. пункт Гарадок Падляскага ваяв., Польшча — канец 1917 ці пач. 1918], беларускі паэт, фалькларыст, публіцыст. У 1909 скончыў царк.-настаўніцкую школу ў Ялоўцы (па інш. звестках Свіслацкую настаўніцкую семінарыю). Настаўнічаў, супрацоўнічаў з газ. «Наша ніва», «Беларускі каляндар», час. «Лучынка». Першы твор, падпісаны псеўд. А., — верш «Песня», апублікаваны ў 1909 у газ. «Наша ніва». Падрыхтаваў да друку зб. «Лірнік», які з-за пач. 1-й сусв. вайны не быў надрукаваны. У 1914 А. мабілізаваны ў армію. За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны Георгіеўскім крыжом. У сваіх творах А. асэнсоўваў стан тагачаснай бел. інтэлігенцыі, сац. і нац. бяспраўе народа, разважаў над праблемамі дабра і зла, жыцця і смерці, праўды і хлусні (вершы «Сяўцам», 1912; «У дарозе», 1913; «Дзіцяці», 1914). Яго творчасць, якую ў арт. «За тры гады» (1913) высока ацаніў М.Багдановіч, вылучаецца традыц. сімволікай, жыццёвай філасафічнасцю, абагульненасцю вобразаў. У ёй адчуваецца ўплыў Ф.Багушэвіча, Я.Коласа і Я.Купалы. А. збіраў і даследаваў бел. нар. песні, выступаў у абарону бел. мовы, прапагандаваў ідэі дэмакратыі, вернага служэння народу. Пераклаў на бел. мову творы Л.Глібава, Г.Гейне, В.Бялінскага.

*Тв.*: Лірнік. Мінск, 1991.

*А.М.Ненадавец.*

**АРОНЧЫК** Юдзіф Самойлаўна (19.12.1908, Мінск — 3.6.1993), беларуская актрыса, рэжысёр. Засл. артыстка Беларусі (1938). Скончыла Бел. драм. студыю ў Маскве (1926). Працавала ў Дзярж. яўр. тэатры Беларусі, у 1950—56 у Тэатры драмы і камедыі пры Белдзяржэстрадзе. Сярод роляў: Гандлярка, Голда («Свята ў Касрылаўцы», «Тэўе-малочнік» Шолам-Алейхема), Рохэлэ («Рэкрут» І.Аксенфельда), Авігайл, Пніна («Суламіф», «Бар-Кохба» С.Галкіна), Мірандаліна («Гаспадыня гасцініцы» К.Гальдоні), Лаўрэнсія («Фуэнтэ Авехуна» Лопэ дэ Вэгі), Марозава («Пяюць жаваранкі» К.Крапівы) і інш. У 1970—90 маст. кіраўнік Мінскага нар. тэатра мімікі і жэста рэсп. Палаца культуры Бел. т-ва глухіх. Ажыццявіла пастаноўкі п'ес «Трыбунал» А.Макаёнка, «Паўлінка» Я.Купалы, «Платон Крэчат» А.Карнейчука, «Хто ёсць хто» Р.Горына, «Сватанне» і «Мядзведзь» А.Чэхава, «Хітрыкі Скапэна» Мальера, «Ты — гэта я» Л.Ленча і інш.

***Ю.Арончык** у ролі Лаўрэнсіі.*



**АРОЧКА** Мікола (Мікалай Мікалаевіч; н. 10.12.1930, в. Вецявічы Слонімскага р-на), беларускі паэт, празаік, крытык, літаратуразнавец, перакладчык. Д-р філал. навук (1981). Скончыў БДУ (1956). Працаваў у рэсп. перыяд. друку. У 1966—98 навук. супрацоўнік Ін-та л-ры імя Я.Купалы НАН Беларусі. Аўтар зб-каў паэзіі «Не ўсе лугі пакошаны...» (1958), «Ветраломная паласа» (1962), «Крылатае семя» (1967), «Кветкі бяссмертніка» (1972), «Матчынажыта» (1978), «Бяздоннае» (1985), «Падземныя замкі» (1986), драм. паэм «Курганне. Крэва» (1982), «Судны дзень Скарыны» (2001) і інш. Асн. тэмы яго твораў — лёс народа, балючая памяць вайны, любоў да роднай зямлі. Даследуе сучасную бел. паэзію, літ. ўзаемасувязі. Аўтар кніг «Валянцін Таўлай» (1969), «Галоўная служба паэзіі» (1974), «Беларуская савецкая паэма» (1979), «Саюз часу і майстэрства» (1981), «Паэзіяівайна» (1987) і інш. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» (т. 1—4, 1999—2003). Піша для дзяцей: кн. вершаў «У птушынай вёсцы», аповесць «Хай расце маладая таполя» (абедзве 1964). Перакладае з рус., латышскай, польск. і англ. моў.

*Тв.*: Колас на ржышчы: выбр. Мінск, 1980; Памяць зярнятаў: выбр. Мінск, 1991.

*Літ.*: Гурская А. «Выток і свет мой...»: штрыхі да творчасці М.Арочкі // Роднае слова. 2001. № 7; Яе ж. Эпас памяці: драмат. паэмы М.Арочкі // Там жа. 2001. № 8; Дашкевіч Г.М. Мікола Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. Мінск, 2003. Т. 4, кн. 2.

*І.М.Гоўдзіч.*

**АРСЕ́НІЙ** Сялунскі, пісьменнік-пілігрым 15 ст. Быў дыяканам, як мяркуецца, у Беларусі. Здзейсніў падарожжа ў Святую Зямлю, якое апісаў у запісках, засн. на запісках ігуме-



*А.Астаповіч. Драпежнік. 1920-я гг.*



*Г.Асташонак. Нож кельцкі. 2008.*

А.Чэхава), Луіза («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Мірандаліна («Гаспадыня гасцініцы» К.Гальдоні) і інш.

**АСТА́ПЕНКА** Зміцрок (Дзмітрый Емяльянавіч; 10.11.1910, в. Калеснікі Смаленскай вобл., Расія — 7.10.1944), беларускі паэт, перакладчык. Скончыў Мсціслаўскі пед. тэхнікум (1929). Працаваў у рэдакцыях рэсп. газет і часопісаў. У 1936 арыштаваны і асуджаны да 8 гадоў пазбаўлення волі. У Вял. Айч. вайну на фронце. Загінуў у Карпатах. Аўтар зб-каў паэзіі «На ўсход сонца», «Краіне» (абодва 1931), «Абураныя» (1932), паэмы «Эдэм» (1944). Пісаў для дзяцей: кніжка-малюнак «Трактар» (1933). Аўтар навук.-фантаст. рамана «Вызваленне сіл» (1932). Перакладаў з рус. мовы.

*Тв.*: Выбранае. Мінск, 1957; Вершы і паэмы. Мінск, 1968.

*Літ.*: Шушкевіч С. Лёс паэта // Шушкевіч С. Выбр. тв. Мінск, 1978. Т. 2; Скрыган Я. Рэквіем // Скрыган Я. Некалькі хвілін чужога жыцця. Мінск, 1990; Маракоў Л. Шасцёра на фотаздымку // Роднае слова. 1999. №6; Камейша К. Зміцрок Астапенка // Полымя. 2005. № 2. *І.М.Гоўдзіч.*

**АСТАПО́ВІЧ** Аркадзь Антонавіч (30.9.1896, Мінск — 21.9.1941), беларускі графік. Вучыўся ў Рысавальнай школе Т-ва заахвочвання мастацтваў у Петраградзе (1914—16). У 1921—22 наведваў рысавальныя класы ў Харкаве. З 1929 у Мінску. Працаваў у жанры лірычнага пейзажа ў тэхніках акварэлі і тушы: «Зімовы надвячорак» і «Дворык» (абодва 1921), «Сакавік» (1923), «Вёска. Калодзеж» (1925), «У заапарку» (1926), «Да вясны (насустрач вясне)» (1940). Аўтар цыкла лінарытаў: «Зіма», «Вясковая вуліца», «Млын», «Царква», «Драпежнік», «Вясковыя могілкі» (усе 1920-я гг.). Афармляў кнігі і часопісы. На радзіме бацькоў у в. Навасёлкі Пухавіцкага р-на на будынку школы, у якой ён выкладаў, устаноўлена памятная дошка.

*Літ.*: Аркадзь Антонавіч Астаповіч, 1896—1941. Зінаіда Антонаўна Астаповіч-Бачарова, 1898—1993: кат. выставкі. Мінск, 1996. *Н.М.Усава.*

**АСТА́ТАК**, тып вуглавога злучэння сцен зрубнай канструкцыі, пры якім круглыя ці брусковыя бярвёны сумежных сцен з рытмічным чаргаваннем насцілаюцца адзін на адзін такім чынам, што іх канцы выходзяць па-за межы аб'ёму пабудовы. Шырока выкарыстоўваўся ў бел. нар. дойлідстве 19 — пач. 20 ст. пры будаўніцтве жылля, клецяў, свірнаў, корчмаў, культавых пабудоў. Вылучаюцца рэгіянальныя адрозненні злучэння сцен з А. У Паазер'і і цэнтр. Беларусі быў пашыраны вугал з 6- або 8-граннай апрацоўкай А. — «у ахрапку». На Палессі прымянялі і вуглавое злучэнне сцен з фігурнай апрацоўкай А. — «на каню».

*Літ.*: Лакотка А.І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мінск, 1999. *Ю.Ю.Захарына.*

**АСТАФ'ЕЎ** Рыгор, беларускі збройнік 17 ст. Родам з Оршы. Быў вучнем у быхаўскага збройніка-пішчальніка Васіля (у 1658). Разам з ім у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 вывезены ў Маскву. Жыў у Броннай слабадзе сярод бел. пасяленцаў-рамеснікаў. У 1677 А. з Амелькам Сяргеевым зрабіў 4, у 1678 — 10 пішчалей.

**АСТА́Ф'ЕЎ** Сценька, беларускі ювелір 17 ст., «майстар сярэбранай справы». Жыў у Полацку. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 разам з вучнем Антошкам Шчасным, пляменнікам Івашкам і інш. полацкімі рамеснікамі вывезены ў Маскву. Працаваў у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля.

**АСТА́ШКАВІЧЫ**, вёска ў Светлагорскім р-не. За 22 км на ПдЗ ад г. Светлагорск, 6 км ад чыг. ст. Астанкавічы на лініі Жлобін—Калінкавічы, 132 км ад Гомеля. Цэнтр Асташкавіцкага с/с. 237 гаспадарак, 421 ж. (2009).

Вядомы з 19 ст. як сяленне ў Карпавіцкай воласці Рэчыцкага павета Мінскай губ. У 1858 — 62 двары, 507 ж. У 1885 — 621, у 1897 — 951 ж.,

шчыне ў гэты дзень спявалі: «Ты, Улас, Улас, // Каля рэчкі, // Ты найміся ў нас // Нашы свіначкі, // Скату пасцівіць!..». Паводле царк. календара на гэты дзень прыпадае свята пакутніка Уласія Севасційскага (каля 316). Епіскап Уласій быў абаронцам дзікіх звяроў, іх лекарам. У многіх рус. губернях на А. прыносілі ў царкву свежае каровіна масла, якое клалі пад абраз святога. Гэтая ахвяра называлася «валожнай» або «валоснай». Хутчэй за ўсё яе назва звязана з язычніцкім святам *Вялеса*.

*Літ.*: Л о з к а А.Ю. Беларускі народны каляндар. Мінск, 2002. *А.Ю.Лозка.*

**АЎРА́МЧЫК** Мікола (Мікалай Якаўлевіч; н. 14.1.1920, в. Плёсы Бабруйскага р-на), беларускі паэт, празаік, перакладчык. Засл. работнік культуры Беларусі (1980). Скончыў БДУ (1949).



*М.Аўрамчык.*

У Вял. Айч. вайну ўдзельнічаў у баях на Паўн.-Зах. і Волхаўскім франтах, быў у фаш. палоне. Працаваў у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя», «Маладосць». Аўтар кніг паэзіі «Пярэдні край» (1949), «Шляхамі дружбы» (1952), «Ключы жураўліныя» (1960), «Сустрэча былых канагонаў» (1963), «Універсітэцкі гарадок» (1967), «Агледзіны» (1969), «Як на далоні» (1970), «Дрэва дружбы» (1973), «Радовішча» (1976), рамана «У падзямеллі» (1986), аповесці «Палон» (1991) і інш. Маст. манеры А. ўласцівы выразнасць і акрэсленасць думкі, трапнае спалучэнне рэаліст. і рамантычных элементаў. Важную ролю ў яго паэзіі адыгрывае аўтабіягр. пачатак, што абумоўлена праблемна-тэматычным і ідэйна-маст. дыяпазонам яго творчасці. Піша для дзяцей (кн. вершаў «Дружба», 1950). Пераклаў на бел. мову творы Дж.Байрана, А.Міцкевіча, Л.Украінкі, М.Джаліля, С.Міхалкова і інш.

*Тв.*: Выбранае. Мінск, 1976; Выбр. творы. Т. 1—2. Мінск, 1980; Анкета: выбр. вершы, паэмы, успаміны. Мінск, 1990; Запрашэнне да роздуму: вершы. Мінск, 1994; Знаёмыя постаці. Мінск, 2004.

*Літ.*: П ы с і н А. З вясны жураўлінай // Маладосць. 1980. № 1; Л о й к а А.А. Паэт — Сустрэча: адкрыты ліст Міколу Аўрамчыку на яго 80-годдзе // Роднае слова. 2000. № 1; Т р э н а с В. Сустрэча з класікам // Маладосць. 2008. № 4. *В.Б.Несцяровіч.*

**АЎРУ́ЦІН** Анатоль Юр'евіч (н. 3.7.1948, Мінск), беларускі паэт, перакладчык. Скончыў БДУ (1972). Працаваў у газ. «Советская Белоруссия» (1995—97), час. «Немига литературная» (1998—2005). Піша на рус. мове. Асн. тэмы яго твораў — разнастайнасць чалавечага быцця, прырода Беларусі, сям'я, каханне. Аўтар кніг паэзіі «Снегапад у ліпені» (1979), «Паваротны круг» (1983), «...З гэтага свету» (1991), «Любоўнае зелле» (1992), «Суд багоў» (2000), «Павер... Успомні... Усумніся...» (2003), «Візітная картка» (2004), «Несамавітая радзіма», «Нежывая вада» (абедзве 2005), «Ісвечка...Імузыка...Іпогляд...», «Святло вячэрняе» (абедзве 2008), «Жнівень у снежні» (2009). Складальнік анталогіі «Сучасная руская паэзія Беларусі» (2003). Перакладае з бел., стараж.-грэчаскай, лац. і інш. моў.

*Тв.*: По другую сторону дыхання: стихи и переводы. Минск, 1998; Золоченая бездна: избр. Санкт-Петербург, 2002; Наедине с молчанием: кн. поэзии. Минск, 2007.

*Літ.*: Анатолий Аврутин. Штрихи к творческому портрету. Санкт-Петербург, 2003; К а р л ю к е в и ч А. Мы — вместе: Минск, 2006; Г н и л о м е д о в В. Три времени Анатолия Аврутина // Неман. 2008. № 7; Анатолий Аврутин — судьба и творчество. Минск, 2008. *І.М.Гоўдзіч.*

**АЎСТЭ́РЫЯ** (італьян. osteria), багаты заезны дом. У Беларусі вядома з 16 ст., асабліва пашырылася з 18 ст. (Глуск, Паставы і інш.). Будавалі з дрэва ці каменю звычайна ў цэнтры горада, мястэчка, каля рынку. У плане мела часцей за ўсё форму прамавугольніка. Акрамя пакояў для падарожнікаў, А. мела залу з лавамі, што стаялі паўкругам ля глінянага каміна; у ёй была і хлебная печ. Часам да А. прыбудоўвалі стайню.

**АЎСЯ́НКА**, вёска ў Горацкім р-не, на р. Галубіна. За 22 км на ПдЗ ад г. Горкі, 19 км ад чыг. ст. Пагодзіна на лініі Орша—Крычаў, 64 км ад Магілёва, аўтадарогай звязана з Горкамі. Цэнтр Аўсянкаўскага с/с. 289 гаспадарак, 854 ж. (2009).

Вядома з сярэдзіны 17 ст. ў Кішчыцкім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1695 — 12 двароў. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у Рас. імперыі. У 1785 у Копыскім павеце, 28 двароў, 151 ж., з 1858 у Горацкім павеце Магілёўскай губ., 71 рэвізская душа. У 1880 — 35 двароў, 160 ж. Частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам, вырабам розных быт. рэчаў з лыка і кары. З 1897 вёска ў Гарадзішчанскай воласці Горацкага павета, 42 двары, 285 ж. З 26.4.1919 у Горацкім павеце Гомельскай, з 27.7.1922 Смаленскай губ. РСФСР. З сак. 1924 у БССР. З 17.7.1924 у Горацкім р-не Аршанскай акругі (да 26.7.1930), з 20.2.1938 у Магілёўскай вобл. У 1926 — 76 двароў, 410 ж. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 да 26.6.1944 А. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У сак. і вер. 1943 гітлераўцы спалілі вёску (82 двары), загубілі 7 ж.

У 2009 дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, комплексны прыёмны пункт, цэх па індывід. пашыве, аддз. сувязі і «Беларусбанка», 2 магазіны; Петрапаўлаўская царква (2007). Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**АЎСЯННІКАЎ** Генадзь Сцяпанавіч (н. 19.2.1935, г. Магілёў), беларускі акцёр. Нар. артыст Беларусі (1974).

манастыроў Б. запрашаліся еўрапейскія дойліды (Я.К.Глаўбіц, І.Фантана III, Я.С.Бекер і інш.).

*Літ.*: Коялович М.О. История базилианского ордена // Христиаиское чтение. 1864. Ч.1; Сульжинский Л. Краткие известия о положении Базилианского ордена и разных переменах в его управлении от 1772 до 1811 г. // Тр. Киевской духов. акад. 1868. Т.3—4; Петров Н.И. Очерк истории базилианского ордена в бывшей Польше // Там жа. 1870 —71. Т. 1—4; Козловский И. Сьезды Базилиан в Зап. Руси // Вестн. Зап. России. 1870. Т. 2. Ч. 4/2; Ваврик М. До історії Василианських капітул в Галичині XVII—XX ст. Рим, 1979; Яго ж. Нарис розвитку і стану василианського чину. Рим, 1979; Саверчанка І. Апостал яднаиия і веры: Язэп Руцкі. Мінск, 1994; Новицкая-Ежова А. Ордеи базилиан и его культурно-просветительская деятельность на укр.-белорус.-лит. землях Речи Посполитой // Славяноведение. 1996. № 2; Клімаў С. Базыльяне на землях Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XVIII ст. // Бел. гіст. агляд. 1996. Т. 3. Сш. 2. *А.А.Суша.*

**БАЙ**, фантастычная істота; герой забаўлянкі ў бел. дзіцячым фальклоры. Назва персанажа ўтварылася, відаць, ад абыгрывання слова «бай» з прыпеву калыханкі «баю-бай» альбо дзеяслова загаднай формы «бай», «баў» — апавядай. Адказам на такое патрабаванне было з'яўленне казачнага Бая, што «ішоў па сцяне ў чырвоным жупане, нёс сямёра лапцей: і жане, і сабе, і дзіцёнку ў лапцёнку». Заканчвалася забаўлянка пытаннем: «Баіць казку ці не?». Калі адказ быў станоўчы: «Бай!» — тады ўсё пачыналася спачатку. «Бай» — узор своеасаблівай адчэпкі, калі на бясконцыя просьбы-патрабаванні дзіцяці баяць байкі (казкі) адказвалі жартам: «Баўлю, баўлю баёначку, узяў кот даёначку, занёс на гару, паклаў на кару, абнёс каля калёс, а хто слухаў, таму — пшых! — у нос». Атрымаўшы такі адказ, дзіця асцерагалася занадта чапляцца да дарослых з просьбамі апавядаць казкі. *У.А.Васілевіч.*



*Бай. Малюнак В.Слаука. 2005.*

**БАЙДА́К**, пласкадоннае драўлянае рачное судна з двухсхільным дахам і мачтай. Даўж. 25—53 м, шыр. 4—10 м, грузападымальнасць 80—250 т. Нос і карма звужаныя. Карма амаль вертыкальная, нос з невял. развалам, бакі крыху разгорнутыя. Па канструкцыі вузкае і непаваротлівае судна, якое хадзіла ўверх і ўніз па цячэнні ракі пад ветразем. Б. з'явіўся ў Беларусі ў 16 ст. ў басейнах Дняпра і Прыпяці, а ў сярэдзіне 19 ст. быў выцеснены больш зручнай *берлінай*.

**БАЙКА**, жанр эпасу; невялікі вершаваны (радзей празаічны) алегарычны твор, сатыр. або павучальны па змесце, у якім жыццё чалавека адлюстроўваецца з дапамогай вобразаў жывёл, раслін, рэчаў. Б. часта мае дыялагічную форму; у ёй шырока выкарыстоўваецца вольны (баечны) верш. У кампазіцыі Б. вылучаюцца 2 часткі: спачатку ідзе апісальная частка, затым афарыстычна выкладзеная мараль: «Другі баран — ні «бэ», ні «мя», // А любіць гучнае імя» («Дыпламаваны баран». К.Крапіва). Мараль таксама можа папярэднічаць асн. часткі: «Бывае, праўда вочы коле...» («Ганарысты парсюк». К.Крапіва). Першыя бел. Б. — Ф.Багушэвіча («Воўк і авечка», «Свіння і жалуды»), А.Абуховіча («Ваўкалак», «Старшына»), А.Гурыновіча («Казельчык») — пераважна пераклады і вольныя наследаванні І.Крылову. Да Б. звярталіся Я.Купала («Мікіта і валы», «Асёл і яго цень», «Два мужыкі і глушэц», «Ігнат і п'яўкі» і інш.), Я.Колас («Баба і куры», «Конь і сабака», «Пан і рэчка», «Пастух і авечкі»), М.Багдановіч («Варона і чыж»). Іх творы вызначаюцца самабытнасцю сюжэтаў, высокім паэт. майстэрствам. Шэраг празаічных баек напісаў Ядвігін Ш. («Павук», «Журавель і чапля» і інш.). Росквіт бел. Б. ў 20 ст. звязаны з творчасцю К.Крапівы, які пашырыў кола герояў, адлюстраваў у Б. рэальнае вясковае жыццё, паводзіны і ўчынкі беларусаў. З бел. байкапісцаў апошніх дзесяцігоддзяў вылучаюцца Э.Валасевіч, У.Корбан, У.Правасуд, М.Скрыпка і інш. *І.М.Гоўдзіч.*